

НА СЦЭНУ ЁН... ВЫЕХАЎ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

ЧЫРВОНКА

ЛЕТА ПА РЭЦЭПЦЕ ДЗМІТРЫЯ КАХНО

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛІПЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 133 (29000)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Наша краіна ўпершыню прымала такія маштабныя мультыспартыўныя спаборніцтвы, як Еўрапейскія гульні. Яны праведзены на высокім арганізацыйным узроўні. Мы ўпэўнена прадэманстравалі, што здольныя арганізаваць і прыняць любое міжнароднае мерапрыемства. Мяркую, што мы высока паднялі планку арганізацыі такіх маладых пакуль спаборніцтваў, устанавіўшы яе на ўзроўні Алімпійскіх гульняў. Пры падрыхтоўцы былі прапрацаваны многія моманты — бязвізавы ўезд у краіну, прыярытэтны пропуск удзельнікаў Гульняў і турыстаў праз дзяржграніцу Беларусі, гатоўнасць спартыўных аб'ектаў, медыцынскае абслугоўванне, меры па бяспецы, транспарт і іншае. Высокі ўзровень арганізацыі і правядзення Гульняў адзначаны прадстаўнікамі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, кіраўнікамі і прадстаўнікамі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў, спартсменамі і трэнерамі. Выдатна сябе праявілі і валанцёры Гульняў, большасць якіх з'яўляюцца студэнтамі беларускіх ВНУ».*

# НА ПЕРШАЙ НІВЕ



Фота БелТА.

**Аграрыі сельгаспрадпрыемства «Агракамбінат «Холмеч» вядуць уборку збожжавых з паказчыкам на 35 % вышэйшым за сярэдні па Рэчыцкім раёне. Гаспадарцы трэба будзе ўбраць збожжавыя на плошчы 3 тысячы гектараў, 1000 з якіх ужо ўбраныя. Паралельна з малацьбой збожжавых на палях актыўна вядзецца ўборка саломы. На здымку: для маладога механізатара студэнта Аляксея ВЫРВІЧА гэта першая самастойная ўборка збожжавых.**

## КОРАТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — чэрвені гэтага года вырас на 0,9 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага.**
- Пасля перапісу насельніцтва адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне Беларусі можа быць перагледжана.
- **Больш за 40 тысяч дзяцей аздаравіліся за першую змену ў лагерах Мінскай вобласці.**
- У Глыбокім 23—27 ліпеня сёмы раз пройдзе міжнароднае свята «Вішнёвы фестываль».




ISSN 1990 - 763X


Экатэхналогіі

# ЭКАНОМІКА ПАВІННА «ПАЗЕЛЯНЕЦЬ»

### Электратранспарт, арганічнае земляробства, экатурызм і разумныя гарады... Што яшчэ?

**Эканамічны рост без шкоды для навакolля, зніжэнне энергаспажывання ў жыллі да 90 кілават на квадратны метр, стварэнне 166 электразарадных станцый для аўто да канца года і даведзенне аднаўляльных крыніц энергіі да 9 % у энергабалансе краіны да 2030-га. Такія мэты ставяць перад сабой арганізацыі і ведамствы Беларусі на шляху развіцця зялёнай эканомікі.**

## Грашовы эфект з мінімальным уздзеяннем

Элементы «азелянення» эканомікі, згодна з Нацыянальным планам дзеянняў па яе развіцці, уключаюць у сябе электратранспарт, гарадскую мабільнасць, разумныя гарады, арганічную сельскую гаспадарку і экалагічны турызм. Комплексны дакумент уяўляе сабой дарожную карту таго, якім чынам будзе адбывацца экалагізацыя эканомікі ў краіне.

— Сёння мы падыходзім да канца рэалізацыі даволі доўгага працэсу, падчас якога як з удзелам міжнародных партнёраў, так і самастойна Беларусь звяртае ўвагу на неабходнасць эканамічнага росту, які не будзе рэалізоўвацца са шкодай для наваколля, — заўважыла **Кацярына КУЗНЯЦОВА, начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.** — Зялёная эканоміка імкнецца прымірыць эканамічны рост і захаванне прыроднага асяродку — пры мінімальным уздзеянні на наваколле.


СТАР. 4




# НА ФОРУМЕ СУСЕДАК

## Прэзідэнт Беларусі знаходзіцца з рабочым візітам у Расіі

**На сёння, 18 ліпеня, запланаваны ўдзел Аляксандра Лукашэнкі разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным у пленарным пасяджэнні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Яно прысвечана міжрэгіянальным сувязям як аснове фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы дзвюх дзяржаў. Таксама ў праграме пашыранае пасяджэнне нацыянальных дзелавых саветаў з удзелам прадстаўнікоў бізнесу Беларусі і Расіі.**

У парадку дня — і двухбаковыя перагаворы прэзідэнтаў, галоўныя тэмы якіх — пытанні развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва краін і ўзаемадзеянне ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Учора Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі нефармальную сустрэчу і наведалі Спаса-Праабражэнскі Валаамскі стаўрапігіяльны мужчынскі манастыр.

Кіраўнікі дзяржаў агледзелі тэрыторыю манастыра, наведалі асноўны яго храм. Там яны падышлі да мошчаў Сергія і Германа — заснавальнікаў Валаама, мошчаў Анціпа Валаамскага, іконы Валаамскай Божай Маці. Каля абраза прэзідэнты і сын кіраўніка беларускай дзяржавы Мікалай Лукашэнка запалілі свечкі.

Асноўныя мерапрыемствы VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі пачаліся таксама 17 ліпеня.

На форуме падпісваюцца пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі абедзвюх краін, камерцыйныя кантракты, іншыя дакументы.

**Паводле БелТА.**

# ДЗЕЙНІЧАЦЬ КАНСАЛІДАВАНА І ЎЗГОДНЕНА

## Эксперты лічаць ініцыятыву «Хельсінкі-2» неабходнай для агульнаеўрапейскай бяспекі

**Ініцыятыва «Хельсінкі-2» неабходная для забеспячэння агульнаеўрапейскай бяспекі. Гаворка пра гэта ішла на экспертнай сесіі «Прыярытэты развіцця Саюзнай дзяржавы» на VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу, перадае карэспандэнт БелТА.**

**Старшыня Асацыяцыі міжнародных даследаванняў імя А. А. Грамыкі, дырэктар Інстытута Еўропы РАН Аляксей ГРАМЫКА** прааналізаваў пазіцыю Саюзнай дзяржавы ў цэлым і Беларусі, і Расіі ў прыватнасці на міжнароднай арэне. «Цярністы шлях да агульнаеўрапейскай бяспекі не абміне «Хельсінкі-2». На фоне развалу сістэмы стратэгічнай стабільнасці і кантролю над узбраеннямі тым больш неабходна дзейнічаць кансалідавана і ўзгоднена», — перакананы эксперт.

Ён адзначыў, што ва ўмовах сітуацыі ў свеце, якая хутка змяняецца, складана прадказаць, якія агульныя выклікі сумеснай бяспекі з'явяцца ў бліжэйшыя гады. «Але што мы можам зрабіць — гэта павялічваць стрэсаўстойлівасць Саюзнай дзяржавы», — сказаў Аляксей Грамыка.

«Павышэнне прадукцыйнасці працы, інвестыцыі ў чалавечы капітал, навуку, маладзёжную палітыку — відавочная патрабаванні часу», — растлумачыў ён. Эксперт дадаў, што Беларусі і Расіі трэба разам шукаць аптымальныя шляхі па ўдзельнічанні ў мегапраект «Пояс і шлях», які абяцае вялікія дывідэнды.

Як паведамлялася, дыскусію аб неабходнасці арганізацыі новага Хельсінкскага працэсу ў АБСЕ прапанаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пленарным пасяджэнні, прысвечаным урачыстаму адкрыццю 26-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ ў Мінску ў 2017 годзе.

Жыллё маё

# КВАТЭРА НА ПРАЦЯГУ АДНАГО ГОДА — РЭАЛЬНА?

## А чаму б і не!

**З 2020 года дзяржава плануе даваць жыллё шматдзетным сем'ям на працягу года з дня пастаноўкі на ўлік. Такое даручэнне даў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Наколькі актуальнае гэтае пытанне для Міншчыны, высвятляла карэспандэнт «Звязды».**

На першае ліпеня ў Мінскай вобласці ў 17,7 тысячы сем'яў выхоўваецца больш за 57 тысяч непаўналетніх. І колькасць сем'яў, якія абзаводзяцца трыма і больш малымі, з кожным годам павялічваецца. У прыватнасці, у 2010-м такіх у цэнтральным рэгіёне налічвалася крыху больш за 9 тысяч, а на ліпень гэтага года — 17 679. Нараджальнасці спрыяе дзяржаўная падтрымка шматдзетных, у тым ліку выдзяленне сямейнага капіталу, забеспячэнне іх на льготных умовах жыллём.

— Па стане на 1 студзеня 2019 года на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у Мінскай вобласці стаяць 6843 шматдзетныя сям'і. Мы павінны да канца 2019-га і на працягу 2020 года іх забяспечыць жыллём. А ў наступным годзе стаіць задача, каб пасля пастаноўкі на ўлік яны атрымлівалі жылплошчу на працягу аднаго года, — паведаміў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Аляксандр КРУЧАНАЎ.** — У 2018-м кватэрамі былі забяспечаны 730 шматдзетных сем'яў. За першае паўгоддзе гэтага года займелі асабісты дах над галавой яшчэ 496, што склала 25 % ад гадавога задання. Гэта рознае жыллё: і сацыяльнае, і арэнднае, і індывідуальнае, набытае на другасным рынку, пасля рэканструкцыі. Да канца года мы павінны забяспечыць «квадратамі» 2112 сем'яў, а ў будучым годзе — 3,5 тысячы. Таму да першага кастрычніка неабходна падрыхтаваць праектна-каштарысную дакументацыю з задзелам на наступны год. Найбольшая колькасць шматдзетных сем'яў мае патрэбу ў жыллі ў горадзе Жодзіна, Барысаўскім, Салігорскім, Мінскім і Маладзечанскім раёнах. У прыватнасці, у апошнім стаяць на ўліку 700 сем'яў. У горадзе актыўна забудоўваюцца новыя мікраёны, дзе ў першую чаргу жыллё будуць прапаноўваць менавіта гэтай катэгорыі грамадзян.

Мінаблвыканкам кантралюе ход работ па будаўніцтве кожнага дома і тэрміны яго здачы. Але і на месцах павінны клапаціцца пра кожную шматдзетную сям'ю. Толькі ў гэтым выпадку райвыканкамы будуць працаваць над вырашэннем пытання і актыўна будаваць жыллё, адзначыў Аляксандр Кручанаў. На яго думку, планы рэальныя і будуць выкананы. У раёнах наладжана сістэма давання жылля. У першую чаргу ім забяспечваюцца сем'і, дзе гадуецца чатыры і больш непаўналетніх, затым — з трыма выхаванцамі, у залежнасці ад даты пастаноўкі на ўлік. Пасля ідуць астатнія катэгорыі — дзеці-інваліды, дзеці сіроты ды іншыя. Для атрымання пасведчання, якое пацвярджае статус шматдзетнай сям'і, неабходна звярнуцца ў сацыяльную службу раёна, потым — у «адно акно» райвыканкама, напісаць заяву на пастаноўку на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прынесці копіі пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей, пашпарты бацькоў. Сем'і, зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, бяруць на ўлік сельвыканкамы.

— А колькі працэнтаў кошту новага жылля пакрывае дзяржава? — спытала я ў Аляксандра Кручанава.

— Для сем'яў, дзе гадуюцца тры дзіцяці, дзяржава гасіць 75 % асноўнага доўгу. Калі чацвёра і больш, то цалкам. Але гэта з разліку па дваццаць квадратных метраў на чалавека, — растлумачыў спецыяліст.

Для шматдзетных грамадзян будуецца жыллё тыпавых спажывецкіх якасцяў. Пастановай Савета Міністраў абмежаваны гранічны ўзровень крэдытавання кошту квадратнага метра. На сённяшні дзень гэта 718 рублёў. Натуральна, што пры распрацоўцы праектаў падбіраюцца эканомныя варыянты. «Гэта жыллё эканом-класа для шматдзетнай катэгорыі грамадзян і для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. І яно карыстаецца попытам. Калі раней наваселы самі рабілі рамонт пры засяленні ў кватэру, то цяпер у асноўным дом здаецца з поўнай апрацоўкай — паклеенымі шпалерамі, пафарбаванай падлогай і столлю», — канстатаваў суразмоўнік.

Усяго ж на пачатак студзеня 2019 года на Міншчыне на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — больш за 85 тысяч сем'яў. Сярод іх каля 32 тысяч маладых, а таксама больш за 6 тысяч дзяцей-сірот.

— Мы скіраваны на тое, каб выканаць задачу, што паставіў перад намі кіраўнік дзяржавы, — забяспечыць у наступным годзе жыллём 3,5 тысячы шматдзетных. Акрамя таго, летась уразлівым катэгорыям грамадзян дадзена 486 кватэр плошчай больш за 19 тысяч квадратных метраў, што пераўзыходзіць пазалеташні перыяд у пяць разоў. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 488 кватэр сацыяльнага прызначэння агульнай плошчай 25 тысяч квадратных метраў за кошт розных крыніц фінансавання, — расказаў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** на 15-й сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. — Такія дамы здадзены ў Маладзечне, Смалявічах, Барысаве, Дзяржынску, пасёлку Дружны Пухавіцкага раёна. У некаторых раёнах для гэтай катэгорыі грамадзян выдзяляліся плошчы ў дамах камерцыйнага фонду.

Усяго ж у 2018 годзе на Міншчыне ўведзена ў эксплуатацыю больш чым 1,114 мільёна жылля, што складае каля 30 % ад агульнага аб'ёму па краіне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### El Mundo: ЗША прыгразілі краінам, якія прапануюць увесці «падатак на Google»

Улады ЗША папярэдзілі пра тое, што могуць прыняць меры ў дачыненні да краін, якія плануюць абкладаць дадатковым падаткам найбуйнейшыя кампаніі, якія прапануюць лічбавыя паслугі. Пра гэта паведаміла газета El Mundo. Гаворка ідзе пра такія гіганты, як Amazon, Apple, Facebook і Google.

Як перадае выданне, Дзяржэдэпартамент ЗША накіраваў у свае пасольствы тых дзяржаў, якія разглядаюць магчымасць увядзення так званага «падатку на Google», у тым ліку ў Іспанію, дакумент, у якім адзначаецца, што адміністрацыя прэзідэнта Дональда Трампа «не пацерпіць ніякай дыскрымінацыі супраць кампаній са штаб-кватэрамі ў ЗША».

У дакуменце пасольствам даручана папярэдзіць улады краін пра верагодныя меры ў выпадку, калі ўрады распачнуць такія крокі ў аднабаковым парадку. Пры гэтым у пасланні не ўдакладняецца, пра якія канкрэтна меры можа ісці гаворка. «ЗША прааналізуюць усе законныя магчымасці, каб адказаць любой краіне, якая ўвядзе падатак на лічбавыя паслугі з патэнцыйна дыскрымінацыйным уздзеяннем», — гаворыцца ў дакуменце. Улады ЗША лічаць, што «існуюць некаторыя ўрады, асабліва ў Еўропе», якія палітызуюць гэтае пытанне.

### Джонсан плануе правесці датэрміновыя выбары ў Вялікабрытаніі да лета 2020 года

Фаварыт выбарчай гонкі за пасады лідара кансерватыўнай партыі і прэм'ер-міністра Злучанага Каралеўства Борыс Джонсан мае намер правесці датэрміновыя ўсеагульныя выбары ў Вялікабрытаніі да лета 2020 года. Пра гэта паведаміла ў серады газета The Times.

Па звестках газеты, каманда Джонсана збіраецца ўнесці «рашучыя карэктывы» ў выбарчую кампанію торы, і падрыхтоўка да іх ужо пачалася.

«Ёсць жаданне правесці выбары, пакуль лейбарысцкую партыю ўзначальвае Джэрэмі Корбін, — заявіў выданню адзін з прыхільнікаў Джонсана. — Гэтая партыя раз'ядная — Brexit (выхад Вялікабрытаніі з ЕС. — **«Зв.»**) учыніў ім магутны ўдар. Лейбарысты не гатовыя да ўдзелу ў выбарах».

У той жа час, як заўважае The Times, прадстаўнік Джонсана сказаў, што «планаў па правядзенні выбараў да 2022 года пакуль няма». «Асноўная ўвага надаецца перамозе ў кампаніі» за пасады лідара кансерватыўнай партыі і прэм'ер-міністра.

### Вырашаная загадка стварэння Стоўнхэнджа



Вучоныя Ньюкаслскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) прыйшлі да высновы, што будаўнікі Стоўнхэнджа выкарыстоўвалі свіны тлушч для транспарціроўкі масіўных камянёў на вялікіх санках. Пра гэта паведамляецца ў прэс-рэлізе на Phys.org.

Даследчыкі выявілі рэшткі тлушчу на рэштках глінянага посуду, знойдзеных пры раскопках мегалітычнага паселішча Дарынгтан-Уолс, размешчанага за 3,2 кіламетра ад Стоўнхэнджа. Тут жылі людзі, якія ўдзельнічалі ў будаўніцтве кромлеха. Аналіз паказаў, што тлушч знаходзіўся ў сасудах, якія больш нагадвалі вёдры, а не посуд для гатавання і падачы ежы. Навукоўцы мяркуюць, што знойдзеныя ёмістасці выкарыстоўваліся для захоўвання сала.

Цяпер даследчыкі прызнаюць, што велізарныя мегаліты, з якіх складаецца Стоўнхэндж, былі перамешчаныя з дапамогай чалавечай сілы. Эксперыменты паказалі, што камяні, якія ў вышыню дасягаюць васьмі метраў, а важаць да дваццаці тон, маглі рухаць 20 чалавек, змяшчаючы іх на сані, якія слізгалі па бярвеннях. Хутчэй за ўсё, бярвёны або самі сані змазвалі для памяншэння сілы трэння.

Падаткі

# НЕ ЗУСІМ МАЛЕНЬКІ ГАДАВЫ ДАХОД

## За мінулы год самы вялікі заробак — больш за 25 мільёнаў рублёў

**Падача падатковых дэкларацый па падаходным падатку нашымі суграмадзянамі за мінулы год завяршылася яшчэ 1 красавіка.**

Падатак трэба было паспець заплаціць у бюджэт не пазней за 3 чэрвеня. Даць справаздачу перад падатковай трэба было тым, хто атрымаў даходы ад продажу грузавіка або аўтобуса, двух і больш аўтамабіляў, а таксама ад продажу больш чым адной кватэры, жылога дома, дачы, садовага доміка, гаража або зямельнага ўчастка. Падатковую дэкларацыю таксама неабходна было падаць пры атрыманні ў якасці падарункаў сумы звыш 6116 рублёў з усіх крыніц на працягу года. Выключэнне — атрыманне даходаў ад блізкіх сваякоў. Дэклараванню падлягалі і даходы, атрыманыя з-за мяжы або за мяжой.

Падатковыя дэкларацыі сёлета прадставілі 30 413 чалавек — на 11,2 працэнта больш, чым годам раней. Найбольшая сума задэклараванага гадавога даходу склала 25,2 мільёна рублёў, вылічанага падаходнага падатку — 3,3 мільёна рублёў. Найбольшыя сумы падаходнага падатку паступілі ў бюджэт Мінска і Мінскай вобласці, паведаміла **намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА.**

Галоўнай асаблівасцю гэтай кампаніі дэклаpавання з'яўляецца змяненне тэрміну прадстаўлення падатковай дэкларацыі з 1 сакавіка на 31 сакавіка і змяненне тэрміну выплаты падаходнага падатку з гадавога даходу з 15 мая на 1 чэрвеня. Перш за ўсё гэта звязана з неабходнасцю даць грамадзянам дадатковы час для збору дакументаў, звязаных з выплатай падатку з даходаў, атрыманых за мяжой.

Іншая важная асаблівасць кампаніі — гэта прадастаўленне права грамадзянам-карыстальнікам размешчанага на партале міністэрства сэрвісу «Асабісты кабінет фізічнай асобы» магчымасці запаўнення падатковых дэкларацый у электронным выглядзе. Зайшоўшы ў свой асабісты кабінет і націснуўшы патрэбную кнопку, кліент атрымлівае ўжо запоўненую ў электронным выглядзе дэкларацыю.



Яму застаецца толькі праверыць правільнасць указання ў дэкларацыі ўсіх рэквізітаў і памеру атрымманага даходу. Пры неабходнасці ён уносіць у такую дэкларацыю неабходныя карэкціроўкі і затым адпраўляе яе ў электронным выглядзе ў падатковы орган.

У асабістым кабінеце плацельшчыка рэалізаваны і шэраг іншых магчымасцяў, якія істотна спрашчаюць парадак узаемадзеяння плацельшчыка і падатковага органа. З'явілася магчымасць атрымаць у электронным выглядзе паведамленне на выплату падаткаў.

У гэтым годзе праз асабісты кабінет фізічнай асобы пададзена 6941 падатковая дэкларацыя ў электронным выглядзе. У параўнанні з мінулым годам колькасць пададзеных у электронным выглядзе падатковых дэкларацый павялічылася ў шэсць разоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Чулі?!

# СВЯТЛОМУЗЫЧНЫ ФАНТАН НА ВАДЗЕ

## Такі мультымедыйны комплекс пабудуе Ашчадбанк у падарунак нашай сталіцы

**У Мінску адбылася цырымонія закладкі памятнага знака, якая пазначыла пачатак будаўніцтва святломузычнага фантаннага комплексу на рацэ Свіслач. Гэта падарунак гораду і яго жыхарам ад расійскага Ашчадбанка — падзяка за доўгія гады плённай работы банка на тэрыторыі нашай краіны. Фантан у Мінску, які будзе запушчаны ў ліпені 2020 года, стане першым унікальным інавацыйным фантанам на вадзе, пабудаваным Ашчадбанкам.**



Праект па ўзвядзенні новага фантаннага комплексу — вынік плённай сумеснай працы Ашчаднага банка, кіраўніцтва нашай краіны і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. У яго аснове — канцэпцыя «разумнага» фантана, які можна выкарыстоўваць як мультыфарматную адукацыйную пляцоўку. Фантан абсталяваны відэапраектарам і лазернай сістэмай для праецыравання малюнка на водную роўнядзь і можа прайграваць гукавыя і візуальныя асветніцкія праграмы, разлічаныя на дзіцячую і дарослую аўдыторыі.

Фантанны комплекс будзе выкананы ў форме прамавугольніка памерам 90х16 метраў. Праектам прадугледжана 199 струменяў, якія дасягаюць вышыні 30 метраў і фарміруюць такія эфекты, як бягучая дарожка з 92 фарсунак, бакавыя дугі, паваротныя струмені, веееры, лілеі і водны экран для трансляцыі мультымедыйнага шоу. Урачыстае адкрыццё комплексу запланавана на 2020 год, ён будзе размешчаны ў акваторыі ракі Свіслач побач са скверам імя Янкі Купалы.

— Мінск — выдатны горад, ён прыгажэе з кожным годам. Фантастычна чыстыя і светлыя вуліцы і ўсмешлівыя людзі. Хочацца ўнесці ў гэты горад часцінку сваіх добрых пажаданняў. Калі нарадзілася ідэя стварэння гэтага фантаннага комплексу, яе падтрымаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, і мы ўдзячныя яму за падтрымку. Гэта будзе ўнікальны аб'ект, падобных да яго — адзінкі ва ўсім свеце, — адзначыў **першы намеснік старшыні праўлення Ашчаднага банка Аляксандр ВЯДЗЯХІН.**



**Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН** падзякаваў Ашчадбанку адразу за некалькі падарункаў. Па-першае, за ўнікальны фантан, які стане новым пунктам прыцягнення гараджан. А па-другое, Ашчадбанк зноў вярнуў у Мінск атмасферу міжнародных спартыўных гульняў: упершыню ў Беларусі праходзіць міжнародная Ашчадбанкіяда.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Цікава!

# Лета, багатае на знаходкі

**Студэнты-гісторыкі БДУ знайшлі каля 5000 артэфактаў I тысячагоддзя нашай эры.**

Археалагічныя раскопкі вядуцца на гарадзішчы ў вёсцы Цясты Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. У экспедыцыі бяруць удзел першакурснікі гістарычнага факультэта БДУ пад кіраўніцтвам выкладчыкаў.



Закладзены раскоп на плошчы 80 квадратных метраў дазволіў археолагам знайсці прадметы, якія адлюстроўваюць бытавую культуру плямёнаў балтаў. Сярод іх знаходак — рыбалоўныя кручкі, нажы, шылы, сякеры, прасніца, прадметы ўзбраення. Знойдзены таксама ўпрыгажэнні з жалеза і бронзы: гэта бранзалеты, шпількі, бляшкі, пранізкі. Здабыткам археолагаў стала і вялікая колькасць разнастайнай керамікі. Яна ўся ляпная, але значна адрозніваецца паміж сабой. Частка посуду адносіцца да днепра-дзвінскай археалагічнай культуры і датуецца I—IV стагоддзямі нашай эры. Ёсць у знойдзенай калекцыі і фрагменты позняй керамікі, праўда, пакуль што не атрымалася высветліць яе паходжанне.



Экспедыцыя ў Цястах працягнецца да 24 ліпеня. За гэты час археолагі плануюць знайсці печ-домніцу, жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы дадзенага перыяду. Канкрэтную перыядызацыю знойдзеных артэфактаў дапамогуць высветліць далейшыя навуковыя даследаванні.

Трэба дадаць, што ўпершыню гарадзішча даследавалася ў пачатку 1980-х. З тых часоў археалагічныя раскопкі тут не вяліся.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзь у курсе!

# ПАВЕТРАНЫМ БОРТАМ — У СТАЛІЦУ БАВАРЫІ

**15 ліпеня авіякампанія «Белавія» адкрыла першы рэйс па маршруце Мінск—Мюнхен.**

Як паведамілі ў прэс-службе перавозчыка, палёты ў Мюнхен будуць выконвацца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з Мінска па панядзелках, чацвяргах, пятніцах ды нядзелях і прыбыццём у Міжнародны аэрапорт Мюнхен у 13.35. Зваротны рэйс з Мюнхена плануецца выконваць з вылетам у 14.15 і прылётам у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 17.15. Час для абодвух аэрапортаў указаны мясцовы.

Палёты плануецца ажыццяўляць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175 умяшчальнасцю 76 месцаў. Час знаходжання ў паветры складзе каля дзвюх гадзін.

Кошт авіябілетаў пры набыцці на сайце авіяперавозчыка ў адзін бок складзе ад 115 еўра з улікам таксаў і збораў, і ад 225 еўра — туды-назад. Міжнародны аэрапорт Мюнхен размешчаны за 30 кіламетраў ад горада. Дарога ў аэрапорт займае 40—45 хвілін у залежнасці ад выбранага транспарту.

Дагэтуль беларускі авіяперавозчык выконваў рэгулярныя рэйсы на наступных нямецкіх напрамках: Берлін, Франкфурт і Гановер.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Асцярожна!

# ФІНАНСАВЫЯ АШУКАНЦЫ «АСЯДЛАЛІ» VIBER

**Буйныя банкі краіны інфармуюць сваіх кліентаў пра выпадкі махлярства з выкарыстаннем метадаў сацыяльнай інжынерыі праз Viber.**

Так, карыстальнікам Viber прыходзіць паведамленне з несапраўднага акаўнта «Беларусбанк анлайн». Акаўнт мае лагатып банка і зарэгістраваны на замежным нумары тэлефона.

Паведамленне можа мець наступны змест: «Паважаны кліент Беларусбанка, наша служба падтрымкі спяшаецца паведаміць вам, што ў сувязі з частымі выпадкамі махлярства ваша карта заблакаваная. Баланс 0.01 BYN. Вам трэба звярнуцца ў найбліжэйшае аддзяленне банка або па нашых кантактах у Viber». Ці можа быць такі выгляд: «Служба падтрымкі Беларусбанка інфармуе, што ў сувязі з частымі ашуканскімі аперацыямі па патрабаванні службы бяспекі ваша карта заблакаваная. Баланс вашай карты 0.00 рублёў. Для разбору рэкамендуем звярнуцца ў банк альбо звязацца па нашых кантактах у Viber». У сувязі з гэтым Беларусбанк заклікае кліентаў быць уважлівымі, не перадаваць трэцім асобам інфармацыю аб рэквізітах плацежных картак, лагін і пароль для ўваходу ў інтэрнэт-банкінг, 3D-пароль або аднаразовы СМС-пароль, у тым ліку шляхам уводу даных на сумнеўных вэб-старонках.

Таксама пра выпадкі махлярства папярэджвае Пріорбанк, нагадваючы, што пры атрыманні падобнага паведамлення не варта звязвацца з адпраўшчыкам і не перадаваць яму асабістую інфармацыю. МТБанк таксама звяртае ўвагу кліентаў на выпадкі махлярства ў Viber з рассыланнем падобных паведамленняў нібыта ад імя банка.

Варта памятаць, што банк ніколі не запытвае ні поўны нумар карткі, ні перыяд дзеяння, ні паролі ад інтэрнэт-банкінга.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЭКАНОМІКА ПАВІННА «ПАЗЕЛЯНЕЦЬ»



nurmolod.ru

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

План распрацаваны да 2020 года і ўключае ў сябе некалькі катэгорый. Напрыклад, стварэнне ўмоў для ўстойлівага спажывання і вытворчасці, каб і спажывец, і вытворца эканомна ставіліся да прыродных рэсурсаў. 30 % мерапрыемстваў, якія прадугледжаны дакументам, ужо выкананы, і даволі паспяхова, 70 % — у працэсе рэалізацыі, кажуць спецыялісты. Яны ж раяць звярнуць увагу на ахоўныя і асабліва ахоўныя тэрыторыі краіны, якіх у Беларусі больш за 9 % і ад якіх можна атрымліваць дадатковы прыбытак.

**— Тое, што мы захоўваем біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, — добра. Аднак мы можам атрымліваць эканамічны эфект і пры гэтым вытрымліваць мінімізацыю ўздзеяння на гэтыя тэрыторыі, — кажа Кацярына Кузняцова.**

## Электрааўто і турыстычныя электробусы

Дасягненні краіны ў развіцці зялёнай эканомікі пацвярджаюцца міжнароднымі таварыствамі і адпаведнымі ўстаноўамі ў экалагічных рэйтынгах. Летась у індэксе дасягнення глабальных мэт устойлівага развіцця Беларусь заняла 23-е месца сярод больш чым 170 краін. А па індэксе эфектыўнасці намаганняў у сферы аховы клімату наша краіна на 29-м месцы. Сем з сямнаццаці мэт устойлівага развіцця экалагічныя, і шмат у чым дзякуючы дасягненням у экалагічных мэтах наша краіна атрымала такі высокі бал, канстатуе **Надзея БАТАВА, загадчык сектара эколага-эканамічных праблем Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:**

— У межах развіцця электратранспарту да 2022 года будзе выпушчаны першы электрамабіль айчыннай зборкі на базе кітайскага. У краіне курсіруе больш за 80 электробусаў, у тым ліку турыстычныя электробусы на тэрыторыі заказнікаў. На аўтазапраўках «Беларуснафта» ўжо дзейнічаюць 84 электразарадныя станцыі. Да канца года з'явіцца яшчэ 166. Па тэмпах развіцця такіх станцый мы апярэджаем Эстонію, якая доўгі час была сусветным лідарам гэтага кірунку.

Яшчэ на пачатку 2015-га ў краіне было 27 электрамабіляў, цяпер іх больш за 240. Акрамя падтрымкі на дзяржузроўні, павелічэнню колькасці электратранспарту спрыяе і тое, што яго ўладальнікі вызвалены ад выплаты дзяржпошліны і падатку на дабаўлены кошт.

## «Зялёныя гарады» і бясплатныя рэсурсы

На ўзмацненне зялёнага сектара эканомікі працуюць розныя ведамствы. У Акадэміі навук, напрыклад, вывучаюць праблемы глыбіннай перапрацоўкі торфу для атрымання ўгнаенняў, бо паліць торф цяпер — недапушчальная раскоша. Даследаванні па другасным забалочванні месцаў выпрацаваных тарфянікаў паказваюць, што гэта дазволіць пазбегнуць узгарання такіх мясцін і надасць ім другое жыццё, расказвае **Людміла КРАЎЧУК, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі аптымізацыі геасістэм Інстытута прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

А Закон аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі, які арыентаваны на экспарт і ўступіць у сілу ў канцы гэтага года, задасць рамачныя ўмовы развіцця гэтага кірунку і дасць дадатковы імпульс яго развіццю, лічыць Надзея Батава:

— Пакуль жа ў краіне толькі 27 сертыфікаваных вытворцаў арганічнай прадукцыі, у тым ліку прадпрыемствы, якія прымаюць і нарыхтоўваюць ягады, дзікаросную прадукцыю, бяроразавік і сельгаспрадукцыю.

Не менш цікавым стане будаўніцтва першага рэсурсанезалежнага дома-парку, які будзе працаваць на альтэрнатыўных крыніцах энергіі. Яго аўтары абяцаюць, што жыхарам не давядзецца плаціць за цяпло і электрычнасць. Калі ўсё атрымаецца, гэта будзе сапраўды прарыў у экабудаўніцтве, лічаць спецыялісты.

**Ірына УСАВА, кіраўнік праекта «Зялёныя гарады», прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі,** адзначыла, што ў межах праекта яны працуюць на мясцовым узроўні з гарадскімі адміністрацыямі, таму што больш шансаў насельніцтва пражывае менавіта на тэрыторыях сярэдніх і малых гарадоў:

— Мы распрацоўваем стратэгічнае бачанне развіцця нашых гарадоў: Полацка, Наваполацка, Навагрудка, дапамагаем ім рэалізаваць пілотныя праекты па павышэнні энергаэфектыўнасці. У Навагрудку, напрыклад, гэта сістэма разумнага вулічнага асвятлення і смартсістэма спажывання рэсурсаў для жылога дома. Пытанні развіцця гарадской мабільнасці праз веларух — у Полацку і Наваполацку. Да праекта «Зялёныя гарады» нядаўна далучыліся Гарадок, Зэльва, Крычаў і Карма. Для іх распрацоўваецца план зялёнага горадабудаўніцтва.

Тым не менш, напланаваўшы шмат інавацыйных цікавых ідэй у будаўніцтве зялёнага горада, неабходна шукаць сродкі для рэалізацыі гэтых праектаў. Таму пытанне, звязанае з «зялёнымі фінансамі», павінна выходзіць на першы план. Каб прасоўваць новыя экатэхналогіі ў краіне, трэба рабіць чарговы крок па распрацоўцы крытэрыяў экалагічнасці і энергаэфектыўнасці, упэўнена яна.

## Аднаўляльныя крыніцы энергіі

Важная роля ў энергаэфектыўнасці адводзіцца таксама аднаўляльным крыніцам энергіі: ветру, сонцу і вадзе.У Германіі і Італіі гэтыя рэсурсы займаюць 15 % у энергабалансе краіны і, адпаведна, робяць унёсак у экалагізацыю, падзяліўся **Леанід ПАЛЯШЧУК, намеснік дырэктара Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі:**

**— У Беларусі створана пакуль каля 6,2 % (каля 400 МВт) магутнасцяў на аднаўляльных крыніцах энергіі. Да 2030 года мяркуецца дасягнуць 9 %. Аднак гэта ўсё яшчэ не 15 %, якія дазволяць развівацца ў межах зялёнай эканомікі.**

У сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі мадэрнізацыя жылля заклікана знізіць энергаспажыванне на 40 % і давесці ў далейшым гэты паказчык да 90 кВт на квадратны метр замест цяперашніх 200 кВт. Праўда, ужо існуюць пілотныя праекты ў Магілёўскай і Гродзенскай абласцях, дзе гэты ўзровень — 25 кВт на квадратны метр, заўважыў спецыяліст.

— Вялікую ролю ў павышэнні энергаэфектыўнасці будзе адыгрываць укараненне прынцыпаў дзяржаўных зялёных закупак, калі дзяржава ўвядзе пэўныя патрабаванні да вытворчасці на тэрыторыі краіны, да продажу спажыўцу тавараў і аказання паслуг, якія будуць адпавядаць пэўным экалагічным крытэрыям і патрабаванням па энергаэфектыўнасці, — перакананы **Андрэй МІНЯНКОЎ, начальнік аддзела навукова-тэхнічнай палітыкі і знешнеэканамічных сувязяў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі.**

Прыкладам павышэння энергаэфектыўнасці служыць таксама перавод канцэляў на драўніннае паліва і павышэнне такой эфектыўнасці ў новым жыллі. За кошт росту цаны на паліва (на 8—17 %) энергаспажыванне ў доме зменшаецца ў два—чатыры разы і дазваляе выкарыстоўваць энергію аднаўляльных крыніц. А вось павысіць энергаэфектыўнасць у існуючым жыллі мяркуюць, далучыўшы да працэсу самiх грамадзян і іх сродкі, дзеля чаго рыхтуецца адпаведны праект.

**Ірына СІДАРОК.**



### ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.
Продавец: ИП «Икартайм» Р. Исаян (УНП 101295853) в лице антикризисного управляющего ИП Лужинского А. И.
Пятые повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **2 августа 2019 г.** с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 06.06.2019 г.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Каплеструйный бесконтактный маркиратор | 880,00 |
| Каплеструйный принтер | 880,00 |
| Машина упаковочная ВТН-41 | 1140,00 |
| Мельница | 1640,00 |
| Мельница | 1640,00 |
| Полуавтомат фасовочно-упаковочный У01 | 540,00 |
| Полуавтомат фасовочно-упаковочный У01 | 540,00 |

Местонахождение предметов торгов — Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, тел. для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 04.
**Для участия в торгах необходимо в срок по 01.08.2019 г. до 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель — ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов — 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов.
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

### ЗАО «Белреализация» объявляет о проведении торгов

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве будут проведены **5 августа 2019 г. с 09.00 до 18.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.
Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел. (8017) 298-53-53, +37529 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by. Собственник — ОДО «КАИ-СтройСервис» (УНП 490650126). Предмет торгов — **Капитальное строение с инв. 350/С-57329, общ. пл. 72,5 кв. м, г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А**. Начальная цена — 39 200,00 бел. руб. Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-03.
Для участия в торгах необходимо **в срок по 2 августа 2019 г. до 16.00**: 1) перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY. Величина первого шага торгов составляет 5 % от начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов и оплатить предмет торгов в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY.

Утерянный представительством Белгосстраха по Слуцкому району бланк ПЗКБ «Зеленая карта» (Украина, Молдова 1 месяц — 1 год) серии BY01 № 15730957 в количестве 1 шт. считать недействительным. УНП 100122726

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д.133 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Лот № 1** Минская обл., Смолевичский р-н, г. **Смолевичи**, ул. Советская, д. 82 | | |
| **Магазин № 113** (составные части: пристройка, навес) | 1253,3 кв. м | 614/С-19187 |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу на праве аренды (сроком до 26.08.2117) общ. пл. **0,1255** га для обслуживания здания магазина № 113. Ограничения (обременения): охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 875 968,86 бел. руб.** (цена снижена на 15 %) | | |
| **Лот № 2** Минская обл., Смолевичский р-н, г. **Смолевичи**, ул. Советская, д. 5 | | |
| **Здание кафе «Селянская хата»** | 99 кв. м | 614/С-42969 |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве аренды (сроком до 13.09.2035) общ. пл. **0,0551** га для обслуживания здания кафе «Селянская хата» и склада. Ограничение (обременение): охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0035 га | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 24 993,80 бел. руб.** (цена снижена на 10 %) | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи по лотам № 1 и № 2:** | **15** рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке | |

**Лот № 3 — комплект материалов для строительства магазина**
(Минская обл., Смолевичский р-н, **г. Смолевичи, ул. Песчаная, 5, склады ТРС)**

| Наименование элементов деревянного изделия | Размеры, мм | Ед. изм. | Кол-во, ед. | Общая длина, м. п. | Общий объем, куб. м |
|---|---|---|---|---|---|
| ОЦИЛИНДРОВАННАЯ ДРЕВЕСИНА | | | | | |
| Стеновая заготовка (h = 2,7 м) Оцилиндрован. древесина с выбранным пазом и зарезан. чашками | d 220 | | | 680 | 25,849 |
| СТРОПИЛЬНАЯ СИСТЕМА КРЫШИ (площадь кровли 88 кв. м) | | | | | |
| Стропильные ноги (6,8 м) | 80 х 200 | шт. | 14 | 95,2 | 1,523 |
| Стропильные ноги строганные (6,8 м) | 75 х 200 | шт. | 4 | 27,2 | 0,408 |
| Стропильные ноги строганные (крыльцо) (2,3 м) | 60 х 160 | шт. | 5 | 11,5 | 0,11 |
| Контробрешетка — бруски | 25 х 80 | м. п. | | 133,9 | 0,268 |
| Обрешетка (шаг 300) | 30 х 100 | м. п. | | 330 | 0,99 |
| Лобовая доска строганная (2 ряда) | 22 х 100 | м. п. | | 40 | 0,088 |
| Торцевая доска строганная (2 ряда) | 22 х 100 | м. п. | | 60 | 0,132 |
| ПРОЧИЕ МАТЕРИАЛЫ | | | | | |
| Подкладочный брус | 50 х 160 | м. п. | | 38 | 0,304 |
| Нагеля (бруски березовые) (330 мм) | 23 х 23 | шт. | 714 | 235,62 | 0,125 |
| Бруски монтажные для проемов | 40 х 40 | шт. | | 24 | 0,038 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 14 939,97 бел. руб.**
(цена снижена на 10 %)

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи по лоту № 3:** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Задаток по лоту № 1 — 1 %, по лотам № 2 и № 3 — 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60 BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лоту № 1 — 27.12.2018, по лоту № 2 — 04.09.2018, по лоту № 3 — 26.01.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 01.08.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 30.07.2019 до 17.00** по указанному адресу.
Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. www.cpo.by.
E-mail: auction@cpo.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15867)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Яўген КУРЧЫЧ:

# «Галоўныя перамогі чакаюць наперадзе»



**Ён прыйшоў у беларускую эстраду 19-гадовым юнаком. У вобразе рамантыка з чорнай шавялюрай скраў не адно дзявочае сэрца і запомніўся многім як пераможца тэлепраекта «Акадэмія талентаў». Здавалася, што амплуа салодкагалосага хлопчыка з таямнічай усмешкай прыляпілася да артыста назаўсёды. Але, на шчасце, нешта пайшло не так, і сёння мы ведаем Яўгена Курчыча не толькі як спевака, але і як акцёра, выкладчыка, мастацкага кіраўніка гурта «Маракасы».**

***— Памятаеце свой першы выхад на сцэну?***

— Гэта было эфектна, бо на яе я не выйшаў, а... выехаў на веласіпедзе з песняй Юры Шатунова «Дзяцінства». Спяваць пачаў дзякуючы маме. Яна медработнік, але асоба творчая, самадзейнасць — гэта па яе частцы. Я пастаянна круціўся побач, вось да сцэны і прыкіпеў. Калі гаварыць больш падрабязна пра сябе, то я пайшоў даўгім і цікавым музычным шляхам. У 2011 годзе скончыў Мінскі каледж мастацтваў, зразумела, што там было няпроста. Даводзілася старацца ў тры разы больш, чым астатнім. З другога боку, для мяне тады ўсё было ў навінку, я пагружаўся ў кожны прадмет і выкладваўся па поўнай. У 2016 годзе скончыў з адзнакай Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а ў 2018-м атрымаў ступень магістра мастацтвазнаўства, цяпер вучуся ў аспірантуры.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

размеркаванне

# У БІБЛІЯТЭКАРЫ — З... ФУТБОЛЬНАЙ КАМАНДЫ

**Уявіце, што вам васямнаццаць гадоў. Вы заканчваеце каледж, і наперадзе толькі невядомасць. У галаве процьма пытанняў. Куды размяркуюць? Як без сям'і, адной у чужым горадзе? Усе гэтыя пытанні задавала сабе Ганна ГАРУЧКА мінулай вясной, калі атрымала дыплом бібліятэкара ў Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. Дзяўчына павінна была знайсці для сябе месца адпрацоўкі. І тут вельмі своечасова прыйшла інфармацыя, што ў невялікі гарадок недалёка ад Мінска патрабуюцца работнікі. Аня тут жа патэлефанавала ў смалявіцкую Цэнтральную раённую бібліятэку. Дамовілася, і першага жніўня мінулага года ўжо выйшла на работу ў якасці маладога спецыяліста.**

***— Ганна, кожны дзень да цябе прыходзяць людзі, якія любяць чытаць. А ты сама як ставішся да гэтага занятку? У цябе ёсць любімая кніга?***

— Любоў да чытання з'явілася ў восьмым класе. Мне пашанцавала, бо ў школе літаратуру выкладала вельмі добрая настаўніца. З ёй было цікава аналізаваць творы, даведвацца пра займальныя факты з біяграфіі аўтараў. Так, у мяне ёсць кніга, якая зачапіла асабліва моцна. Яе мне параіла сяброўка. Гэта раман «Шантарам» Грэгары Дэвіда Робертса. Яна захапіла мяне тым, што ў ёй апісваецца жыццё самога аўтара.

***— І ты вырашыла пайсці вучыцца на бібліятэкара?***

— Зусім... не. У школе я захаплялася спортам. Мне прапанавалі ўступіць у жаночую футбольную каманду Магілёва. Я пагадзілася пераехаць з роднай вёскі Шаламы Слаўгарадскага раёна ў горад.



А каледж мастацтваў абрала таму, што ён... знаходзіўся блізка да спартыўнага цэнтра, у якім я павінна была трэніравацца. Аднак з футболам не склалася. Я перастала хадзіць на трэніроўкі ўжо на першым курсе. А вось навучанне бібліятэчнай справе не кінула.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Проста аб сваім

# КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ЁН ЯК КНІГА...

**Любы твор складаецца з пэўнай гісторыі: кароткай ці доўгай, сумнай ці вясёлай. Адна можа адгукнуцца ў сэрцах многіх, другая — не зачэпіць нікога. А вось аповеды ў «Жывой Бібліятэцы» заўсёды запамінаюцца «чытачам», бо «кніга» — сам чалавек з непаўторным жыццёвым досведам, сваім ладам жыцця...**

**У «Жывую Бібліятэку» можа прыйсці кожны. Выбраць сабе «твор» і слухаць яго, гутарыць, задаваць пытанні на працягу адведзенага часу. Чалавек-«кніга» можа прадстаўляць пэўную прафесію, рэлігію, нават сексуальную арыентацыю. Мэта незвычайнай бібліятэкі — узаемаразуменне паміж людзьмі рознага светапогляду, пазбаўленне ад стэрэатыпаў і навязанага іншымі меркавання.**

## Гісторыя ўзнікнення праекта

Фармат пад арыгінальнай назвай Human library ўзнік у Даніі ў 2000 годзе. Арганізатарам стала асацыяцыя Stop The Violence («Спынім гвалт»), якую стварылі падлеткі яшчэ ў 1993 годзе. На іх сябра накінуліся з нажом на вуліцы, ён цудам выжыў. І, пакуль той ляжаў ў бальніцы, таварышы сталі думаць, што менавіта яны могуць зрабіць, каб зменшыць узровень гвалту паміж людзьмі. А ў 2000 годзе іх запрасілі на музычны фестываль Roskilde Festival з просьбай правесці мерапрыемствы, якія дапамаглі б дасягнуць узаемаразумення паміж удзельнікамі. Так і прыдумалі «Жывую Бібліятэку». Ахвотныя маглі выбраць «кнігу» і размаўляць з ёй. Дзякуючы гэтаму на працягу некалькіх дзён паміж сабой кантактавалі сотні самых розных людзей, якія б наўрад ці сталі гутарыць у звычайных абставінах.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Каманда «Жывой Бібліятэкі».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 07 2019 г.

*Прыёмная кампанія — 2019*

# СТАЦЬ АЙЦІШНІКАМ МОЖНА І Ў КАЛЕДЖЫ


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**20 ліпеня ў краіне распачынаецца прыёмная кампанія ва ўстановах, якія рыхтуюць спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.**
**Сёлета ў ёй будуць задзейнічаны 110 каледжаў, у тым ліку 9 — прыватнай формы ўласнасці, а таксама 83 установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. План прыёму гэтага года складае 40,4 тысячы чалавек, з іх на бюджэтнай форме навучання — 25,4 тысячы.**

## КАГО ЧАКАЮЦЬ РАБОТАДАЎЦЫ?

Прыём будзе весціся па 156 спецыяльнасцях. Новая спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне сурдакамунікацыі» адкрыецца ў філіяле Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта «Лінгвагуманітарны каледж».

Акрамя таго, у шэрагу навучальных устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі адкрываецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях, на якія адчуваецца павышаны попыт з боку заказчыкаў кадраў. Сярод іх — «Праграмаваныя мабільныя сістэмы», «Тэсціраванне праграмнага забеспячэння», «Сеткі тэлекамунікацый», «Электроніка механічных транспартных сродкаў», «Тэхнічнае абслугоўванне тэхналагічнага абсталявання і сродкаў робататэхнікі ў аўтаматызаванай вытворчасці (па кірунках)», «Тэхнічная эксплуатацыя абсталявання», «Хімічная тэхналогія перапрацоўкі драўніны», «Тэхналогія машынабудавання (па кірунках)» і іншыя.

Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, штогод каледжы выпускаюць каля дзвюх тысяч спецыялістаў з профільнай IT-адукацыяй, але попыт на кадры з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй працягвае расці...

## ПА КОНКУРСЕ АТЭСТАТАЎ

Абітурыенты, якія паступаюць ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі пасля дзевяці класаў на ўсе спецыяльнасці, акрамя тых, па якіх неабходна здаваць уступныя іспыты (творчыя і спартыўныя), павінны прайсці конкурс сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі.

Абітурыенты, якія паступаюць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, здаюць два абавязковыя ўступныя экзамены па вучэбных прадметах у форме цэнтралізаванага тэсціравання. Пры паступленні на творчыя спецыяльнасці і спецыяльнасці спорту — уступныя іспыты па мове (беларускай ці рускай) у форме ЦТ і іспыты па спецыяльнасці.

У тым выпадку, калі ў папярэдні год конкурс на адно месца складаў 1,5 чалавека і менш, залічэнне праводзіцца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі (без прад'яўлення сертыфікатаў ЦТ), а на творчыя спецыяльнасці і спецыяльнасці спорту — па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі і выніку ўступнага іспыту па спецыяльнасці. Але ў дакуменце аб адукацыі адзнака па вучэбным прадмеце, які адпавядае профільнаму іспыту, павінна быць не ніжэйшай за 4 (чатыры) балы.

Калі абітурыенты паступаюць для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў скарочаны тэрмін (на аснове прафесійна-тэхнічнай), яны здаюць толькі ўступны іспыт па спецыяльнасці. У выпадку, калі ў папярэдні год конкурс на адно месца складаў 1,5 чалавека і менш, залічэнне праводзіцца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

## ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

Уступная кампанія ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі пройдзе **з 20 ліпеня да 17 жніўня.**

Прыём дакументаў на аснове агульнай базавай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове ад абітурыентаў, якія будуць здаваць уступныя іспыты па спецыяльнасці, будзе весціся **з 20 ліпеня да 3 жніўня,** на платнай аснове — **з 20 ліпеня да 14 жніўня.** Уступныя іспыты пройдуць **з 4 да 8 жніўня,** залічэнне на навучанне за кошт сродкаў бюджэту — **да 10 жніўня,** на платнай аснове — **да 16 жніўня.**

Прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (прафесійна-тэхнічнай з агульнай сярэдняй адукацыяй) за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове ад абітурыентаў, якія будуць здаваць уступныя іспыты па спецыяльнасці, пройдзе **з 20 ліпеня да 9 жніўня,** на платнай аснове — **з 20 ліпеня да 16 жніўня.**

Уступныя іспыты адбудуцца **з 10 да 12 жніўня,** залічэнне на навучанне за кошт сродкаў бюджэту — **да 14 жніўня,** на платнай аснове — **да 17 жніўня.**

**Для ўсіх прыёмных камісій устаноўлены адзіны рэжым работы: яны будуць працаваць з 9.00 да 18.00, у тым ліку ў суботы (20, 27 ліпеня, 3 і 10 жніўня). Будуць задзейнічаны таксама і нядзелі (4 і 11 жніўня) для прыёмных камісій тых навучальных устаноў, у якіх у гэты дзень праводзяцца ўступныя выпрабаванні.**

Інфармацыя будзе абнаўляцца кожны дзень не радзей за адзін раз на тры гадзіны работы прыёмнай камісіі (у 12.00, 15.00 і 18.00). У апошні дзень інфармаванне абітурыентаў аб ходзе прыёму дакументаў спыняецца ў 15.00.

Залічэнне тых, хто паступае ў ССНУ на бюджэтную форму навучання на аснове базавай адукацыі, адбудзецца **не пазней за 10 жніўня,** а на платную форму — **да 16 жніўня.** Для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, прыёмная кампанія завершыцца для «бюджэтнікаў» **14 жніўня** і **17 жніўня** — для «платнікаў».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Бачыць мэту*

# ВЫКЛЮЧНА НА «ВЫДАТНА», 
## або Магія лічбаў у залікоўцы


Карына Мікалуць.

**ЛЕТАМ студэнтам не трэба думаць, як выконваць складаныя падлікі ці разбірацца ў філасофіі Гегеля, рабіць бясконцыя, няхай і цікавыя, даследаванні... Здаў усе экзамены — гуляй, як вецер у чыстым полі. Асабліва калі заслужыў, калі ў тваёй залікоўцы добрыя адзнакі: напрыклад, красуецца хоць бы адна дзясятка. Ты з гонарам пазіраеш на яе, хвалішся знаёмым...**

У студэнтак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Карыны Мікалуць, Ганны Шандрохі, Алесі Палулех такіх «прыгажунь» у залікоўках аж па пяць, за кожную сесійную дысцыпліну. І ніякага сакрэту тут няма: у атрыманні дзяўчатамі найвышэйшых адзнак сваю ролю адыгралі стараннасць, руплівая праца і ўпэўненасць у сабе.

Адразу ж улілася ў вучобу і дасягнула поспеху першакурсніца інжынерна-эканамічнага факультэта (спецыяльнасць «электронны маркетынг») **Карына Мікалуць.**

— У БДУІР вырашыла паступаць даўно, ён заўсёды мяне вабіў, — кажа дзяўчына. — Як вядома, IT-спецыяльнасці сёння — адны з самых запатрабаваных і прэстыжных на рынку працы. Разам з тым эканамічны складнік таксама даўно прыцягваў увагу, таму выбар зрабіла на карысць інжынерна-эканамічнага факультэта. Лічу, што ў нас шмат пераваг у параўнанні з падобнымі спецыяльнасцямі ў іншых ВНУ.

Карыне давялося здаваць падчас зімовай сесіі такія новыя для яе прадметы, як «вышэйшая матэматыка», «асновы эканомікі», «асновы алгарытмізацыі і праграмавання» і «філасофія».

— Да іспытаў рыхтавалася, натуральна, не ў апошні момант, — канстатуе выдатніца. — Спрабавала не прапускаць заняткі, асабліва практычныя. Імкнулася выконваць усё, што патрабуюць выкладчыкі: калі яны бачаць, што студэнты стараюцца, стаўленне да іх змяняецца. Таксама даволі шмат часу прысвячала самаадукацыі.

І хоць, здаецца, адказнай першакурсніцы не было пра што турбавацца, усё адно перажывала, а ў ноч перад некаторымі экзаменамі нават штосьці давучвала.

З лёгкасцю пераходзіць на чацвёрты курс таго ж факультэта студэнтка спецыяльнасці «эканоміка электроннага бізнесу» **Ганна Шандроха.** З самага пачатку семестра яна хацела атрымаць максімум пры здачы сесіі, упарта вучыла кожны прадмет, таму была ўпэўнена: усё атрымаецца. Магчыма, дапамог і даўні рытуал — пакласці канспект пад падушку. А перад сном выпіць чай з мятай, каб супакоіцца. Цяпер Ганна паралельна з вучобай працуе бізнес-аналітыкам у кампаніі. Там ёй вельмі падабаецца калектыў. Ці пойдзе туды пасля ўніверсітэта, дзяўчына пакуль не хоча загадваць.


Ганна Шандроха.

**Алеся Палулех** таксама закончыла трэці курс факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання (спецыяльнасць «прамысловая электроніка»). У БДУІР вырашыла паступаць пасля Мінскага радыётэхнічнага каледжа, каб працягнуць навучанне. Спачатку нават і не думала, што атрымае «дзясяткі», але, калі большая частка прадметаў была здадзена, захацелася, каб усё было ідэальна. На саміх іспытах студэнтка, хоць і мандражыравала, але і падбадзёрвала астатніх, тых, хто баяўся і галасіў: «Я не здам».


Алеся Палулех.

Па-за заняткамі выдатніца захапляецца дызайнам інтэр'ераў. Свае веды яна скарыстоўвае на практыцы, але пакуль што толькі дома.

— Планую, як павінна выглядаць памяшканне, якімі маюць быць асвятленне, расстаноўка мэблі, аздабленне сцен і столяў, — тлумачыць Алеся. — Мне падабаецца, калі дома робіцца прыгажэй.

...Цяпер дзяўчаты адпачываюць, радуюцца яркаму і непаўторнаму лету. За гэты час яны, безумоўна, набяруцца сіл, каб зноў змагацца і перамагаць. А «дзясяткі» стануць для іх выдатным стымулам на будучыню.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

*Бізнес пасля ўрокаў*

# ВУЧНЁЎСКІ «ФАРМАТ» ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

**Апошнім часам сярэднія навучальныя ўстановы імкнуцца пашыраць веды вучняў не толькі ў рамках абавязковай школьнай праграмы, але і ў сферы прадпрымальніцтва. Са з'яўленнем тры гады таму ў Даматканавіцкай сярэдняй школе Клецкага раёна бізнес-кампаніі «Фармат» тут зніклі праблемы з тым, дзе раздрукаваць рэферат, зрабіць фота на дакументы ці набыць незвычайны падарунак сябру. А самі школьнікі задаволеныя магчымасцю паспрабаваць сябе ў ролі сапраўдных бізнесменаў!**



Ілья Сідаровіч (злева) і Яўген Фалетар.

У «Фармаце» можна набыць вокладкі, нататнікі, ручкі, календары... Пры жаданні кліенты могуць заказаць канцылярскія тавары з выявай роднага горада, каханай дзяўчыны ці формул па фізіцы. Пры ўдзеле ў розных конкурсах ці навуковых канферэнцыях можа аказацца зручнай паслуга брашуроўкі лістоў — атрымліваецца папка, у якой усё сістэматызавана.

На пазабюджэтныя школьныя сродкі для бізнес-кампаніі быў набыты прынтар для сублімацыйнага друку. Спектр паслуг павялічыўся: з'явілася магчымасць наносіць выявы на кубкі, талеркі, магніты і іншыя загатоўкі. Такія вырабы часцей за ўсё набываюць у якасці падарунка.

У аказанні друкарскіх паслуг у «Фармату» амаль няма канкурэнтаў, што вельмі пазітыўна ўплывае на колькасць кліентаў. Таксама да бізнесменаў-пачаткоўцаў часам звяртаюцца з просьбай пераўстаноўкі Windows.

— Мы нядрэнна разбіраемся ў камп'ютарах, таму можам дапамагчы мясцовым жыхарам, — кажа **Ілья Сідаровіч,** выпускнік школы гэтага года, дырэктар школьнай бізнес-кампаніі.

На пытанне, ці прыносіць бізнес прыбытак, **Яўген Фалетар,** выпускнік 10 класа і фінансавы дырэктар «Фармату», адказаў:

— Зараз наша мэта не ў тым, каб зарабіць шмат грошай, а ў тым, каб паспрабаваць сябе ў якасці прадпрымальнікаў. У будучыні мы ўсе марым імі стаць, бо бізнесмены дзякуючы сваёй працы — паспяховыя людзі.

У найбліжэйшай будучыні «Фармат» плануе развівацца і пашыраць спектр паслуг. У хуткім часе тут можна будзе заказаць нанясенне выявы на майку, бірульку ці фотаальбом. Таксама плануецца стварыць Instagram-акаўнт, дзе будуць выстаўлены ўзоры вырабаў і навінкі. На думку юных прадпрымальнікаў, гэта дапаможа пашырыць кліенцкую базу і спрасціць азнаямленне з прадукцыяй. А цяпер інфармацыю пра бізнес-кампанію можна знайсці на сайце школы.

Пасля гутаркі з прадстаўнікамі «Фармату» на фестывалі «Школа прадпрымальніцтва», які праходзіў у Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, у мяне не засталося ні кроплі сумнення ў тым, што такія мэтанакіраваныя школьнікі абавязкова прыйдуць да сваёй мары: стануць паспяховымі прадпрымальнікамі і шмат чаго дасягнуць у жыцці!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка I курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

# КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ЁН ЯК КНІГА...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

На плакаце з мерапрыемства быў надпіс «Не судзіце кнігу па вокладцы... асабліва калі гэта не кніга», які пазней стане дэвізам сусветнага руху. Пасля фестывалю фармат сталі прасоўваць, пашыраць і развіваць, і ў рэшце рэшт ён распаўсюдзіўся і прыжыўся больш чым у 75 краінах свету.

## Калі і як рух прыйшоў у Беларусь?

У нас «Жывая Бібліятэка» ўпершыню запрацавала ў кастрычніку 2014 года ў Мінску. Тады мерапрыемства арганізавалі Марына Штрахава, Марыя Лукашук і Вольга Арцёмчык. Знаёмства з рухам адбылося выпадкова і нечакана, калі Марына, тады яшчэ студэнтка, паехала ў Польшчу на Study Tours. Яе зацікавіў і ўразіў фармат, які дазваляе вельмі проста расказваць пра дастаткова складаныя тэмы, дыскрымінацыю ў грамадстве. Пасля вяртання дадому дзяўчына распавяла пра праект усім сябрам, якія падзялілі яе захапленне. Аднак ідэя выспявала ў сэрцах яшчэ два гады: заміналі іншыя справы. У 2014-м дзяўчаты нарэшце напісалі дацкім арганізатарам, каб атрымаць дазвол на правядзенне «Жывых Бібліятэк» у Беларусі, выкарыстанне лагатыпа і іншых матэрыялаў. Датчане з радасцю згадзіліся.

На першым мерапрыемстве сабралася 50 чалавек. «Гэта не былі нашы знаёмыя, блізкія людзі: прыйшлі тыя, хто заўважыў аб'яву ў інтэрнэце, — кажа Марына. — І тады мы зразумелі, што ўсё робім правільна, трэба развівацца далей». Першымі «кнігамі» сталі невідушчая, беларускамоўны, вегетарыянцы, той, хто захапляецца посткросінгам, медыятар, занятая ў «сексе па тэлефоне» і іншыя. Потым была далейшая актыўная фаза: набор валанцёраў, распрацоўка канцэпцыі, пашырэнне геаграфіі.

## Хто можа стаць «творам»?

Чалавек з унікальным досведам. Той, хто адрозніваецца ад іншых, хто можа зазнаць дыскрымінацыю, цкаванне, каго не разумеюць і баяцца. Хто належыць да сацыяльнай групы, у дачыненні да якой існуюць стэрэатыпы. Прадстаўнік спецыфічнай прафесіі, стылю жыцця, светапогляду. Той, хто чуе ў свой бок: «Сам(а) вінаваты(ая)!», «З такімі так і трэба!» Важна, каб «кніга» не баялася весці шчыры дыялог, была гатовая цалкам раскрыцца, гаварыць пра набалелае, даказваць, што быць іншым — нармальна.

Для таго каб стаць «кнігай», трэба запоўніць заяўку, у якой напісаць назву «твора» (пра што будзеце расказваць), коратка распавесці пра свой досвед, расказаць гісторыю, назваць прычыну, па якой узнікла жаданне стаць «кнігай», а таксама выбраць, з якой аўдыторыяй будзе зручней за ўсё працаваць (з групай 5—8 чалавек, 2—3 чалавекі, толькі з адным чытачом ці ў закрытым ад іншых памяшканні).

## У планах — пашырэнне

Доўгі час «Жывая Бібліятэка» існавала як ініцыятыва. У ліпені 2017 года супольнасць атрымала рэгістрацыю ў Мінгарвыканкаме. Цяпер у яе восем арганізатараў і больш чым пятнаццаць валанцёраў. Туды людзі прыходзяць працаваць на шчырым энтузіязме, бо мэты супольнасці супадаюць з іх мэтамі.

За чатыры гады праведзена больш за сто «Жывых Бібліятэк», прынята больш за 5,5 тысячы чалавек. Супольнасць пачала дзейнічаць яшчэ ў пяці гарадах: Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Гродне, Маладзечне. Кожны рэгіён працуе самастойна, мае сваіх арганізатараў і ўласныя «знаходкі».

Напрыклад, у адной з апошніх сталічных «Жывых Бібліятэк» «кнігамі» былі фрылансеры; нарказалежны ў рэмісіі; чалавек, які перажыў рак; мама мадэлі з сіндромам Даўна; бісексуалы; практыкуючы будыст і шмат іншых. Акрамя ўласна «Жывых Бібліятэк», арганізатары прыдумалі і іншыя праекты: «Шчырыя размовы», калі людзі таксама гутараць паміж сабой, але на адну выбраную тэму, «Сацыяльныя гульні»... У планах — яшчэ больш фарматаў, пашырэнне аўдыторыі, а таксама развіццё руху ў рэгіёнах.

**Юлія АДАМОВІЧ.**


**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | **ИУП «Эстейт Инвест»,** 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Промышленная, д. 16 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов, реализуемый в составе одного лота: Месторасположение: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, промышленный узел «Колодищи»**

| № | Наименование | Назначение | Инв. № | Общ. пл., кв. м |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Административно-хозяйственное здание № 1** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-89911 | 24,1 |
| 2 | **Административно-хозяйственное здание № 2** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-89910 | 39,3 |
| 3 | **Административное здание № 3 (бухгалтерия)** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-114025 | 33,2 |
| 4 | **Административное здание № 4 (коммерческий отдел)** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-114022 | 41,7 |
| 5 | **Административно-хозяйственное здание № 5** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-114010 | 60,1 |
| 6 | **Производственный корпус № 1** | Здание обрабатывающей промышленности иного назначения | 600/С-89909 | 218,7 |
| 7 | **Производственный корпус № 2** | Производственный корпус № 2 | 600/С-51028 | 6 733,2 |
| 8 | **Административное помещение производства С/П** | Здание административно-хозяйственное | 600/С-114023 | 208,6 |
| 9 | **Склад № 1** | Склад № 1 | 600/С-771 | 333 |
| 10 | **Склад № 2** | Склад № 2 | 600/С-770 | 334 |
| 11 | **Склад № 3** | Склад № 3 | 600/С-767 | 332 |
| 12 | **Склад № 4** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 600/С-95727 | 341 |
| 13 | **Склад № 5** | Склад № 5 | 600/С-769 | 333 |
| 14 | **Бытовое помещение** | Бытовое помещение | 600/С-768 | 63 |
| 15 | **Трансформаторная подстанция** | Трансформаторная подстанция | 600/С-948 | 54,5 |
| 16 | **Временный бытовой корпус** | Временный бытовой корпус | 600/С-949 | 268,8 |
| 17 | **Газорегуляторный пункт (ГРП)** | Газорегуляторный пункт | 600/С-950 | 20,2 |
| 18 | **КПП № 2** | Здание неустановленного назначения | 600/С-114024 | 16 |

**Сведения о земельном участке:** участок площадью **6,0956 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов промышленности

**Начальная цена без НДС – 6 000 000 Евро**

*Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС

Задаток **1 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 22.08.2019 г.** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: по 20.08.2019 г.** до 17.00

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

**Проведение первых повторных торгов по продаже имущества ООО «ФРЕЛИЭЙСЭКСИМ»**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка 5%, бел. руб. | Шаг торгов 5%, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ISUZU AFIC-NQR 75P «LUBAVA», кузов № Y39NR7510B0007660 Z7XN1R75PB0001650 | **17 190,00** | **859,50** | **859,50** |
| 2 | Автомобиль ISUZU AFIC-NQR 75P «LUBAVA», кузов № Y39NR7510B0007659 Z7XN1R75PB0001635 | **17 190,00** | **859,50** | **859,50** |

Торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, каб.18, начало – **6 августа 2019 г., в 10.00**.

**Заявление на участие в торгах и необходимые в соответствии с законом документы должны быть поданы с 09.00 18.07.2019 по 18.00 02.08.2019 по адресу организатора торгов.**

Задаток на участие по лоту составляет 5 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **02.08.2019** на расчетный счет продавца – ООО «ФРЕЛИЭЙСЭКСИМ», ул. Нижняя Луговая, д. 4а, ком. 1п, д. Валерьяново, 223053, Минский р-н, УНП 101517886, р/с BY24BPSB30121014090189330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 704, код BPSBBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в торгах **06.08.2019.** Организатор торгов: ООО «БизнесУэй», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, комн. 18, тел. +375 (29) 1653365. Продавец: ООО «ФРЕЛИЭЙСЭКСИМ». Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия. Цена без НДС. В случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного претендента лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в размере **472 бел. руб. 48 коп.** Срок подписания договора купли-продажи по 16.08.2019. Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в открытых торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by в разделе «Должник – ООО «ФРЕЛИЭЙСЭКСИМ» — имущество – реализация».




УНП 100122726

Добрыя сэрцам

# ПАД АХОВАЙ «СЁМАГА НЕБА»



Валанцёры «Сёмага неба» на добраўпарадкаванні храма Сергія Раданежскага.

**«Калі ёсць жаданне дапамагаць, абавязкова знойдуцца і тыя, каму патрэбная твая дапамога», — упэўнены Іван ДУСЯНОК. Разам з калегамі ён займаецца валанцёрскай дзейнасцю на родным Гомельскім заводзе ліцця і нармаляў. Яна не засталася незаўважанай на рэспубліканскім узроўні. Летась БРСМ прызнаў валанцёрскі атрад «Сёмае неба» найлепшым сярод рабочай моладзі Беларусі.**

«Аднойчы пад Новы год...» — менавіта такой фразай хочацца пачаць гісторыю пра тое, як звычайны электрагазазваршчык Ваня стаў прыносіць радасць людзям.

— Я набыў касцюм Дзеда Мароза дзеля забавы. Віншаваць сваякоў, блізкіх і іх дзетак значна весялей, калі ты ў вобразе. Посах, валёнкі, мех з цукеркамі — у ролю ўжываўся з усёй сур'ёзнасцю, — успамінае хлопец. — Неяк па просьбе сябра віншаваў дачку яго знаёмай, якая працавала сацыяльным педагогам. Жанчыне спадабалася маё выступленне, і яна прапанавала выйсці на вялікую публіку — паваланцёрыць «барадатым чараўніком» у доме-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. І хоць патрэбнага досведу ў мяне не было, я згадзіўся.

**«Азірніцеся навокал. Магчыма, у суседнім доме якраз жыве сям'я, якой неабходна ваша падтрымка».**

Іван прызнаецца, што хваляваўся ў той дзень страшна. Калі выйшаў на сцэну, з галавы вылецелі ўсе словы, забыў сцэнарый. Давялося імправізаваць. Дапамаглі эмоцыі дзяцей, іх усмешкі.

— Дзе адзін ранішнік — там і другі, трэці. Так я далучыўся да валанцёрскага атрада «Эдэльвейс». Унікаў ва ўсе нюансы, набіраўся вопыту і завязваў знаёмствы. Надзвычай важна мець чалавека, які стане тваім настаўнікам у гэтай нялёгкай справе і падкажа, як дзейнічаць. А ў самых непрадказальных сітуацыях — прыйдзе на дапамогу.

Хлопцу спатрэбілася каля пяці гадоў, каб адважыцца на стварэнне асобнага атрада на заводзе.

— Па цэхах у пошуках ахвотных стаць валанцёрамі не хадзіў. У гэтым плане не вельмі дапамог заводскі турзлёт, які ў нас ладзіцца штогод. Там кожнага можна ўбачыць па-за работай, зразумець, наколькі чалавек камандны, як будзе сябе паводзіць у розных абставінах. Спачатку нас было ўсяго шасцёра, цяпер больш за два дзясяткі. Хто? Зваршчык, электрык, слесар-сантэхнік, супрацоўнікі аддзела кадраў і нават кіраўнікі... Людзі розныя. У некаторых па двое-трое сваіх дзяцей. Прычым у атрадзе не толькі работнікі завода ліцця і нармаляў. Далучыліся нашы сябры, якія працуюць на іншых прадпрыемствах. Назву атраду далі рамантычную — «Сёмае неба». Чаму? А гэта ўжо няхай кожны для сябе сам вырашае...

Першыя валанцёрскія крокі каманда Івана рабіла на сваім заводзе.

— Калектыў вялікі. Ёсць шматдзетныя супрацоўнікі, ёсць тыя, хто адважыўся на ўсынаўленне, ёсць сем'і, якія па розных прычынах аказаліся ў сацыяльна небяспечным становішчы. Менавіта ім у першую чаргу і прапанавалі сваю дапамогу — адпраўлялі дзетак «У школу з добрым сэрцам». Гэта акцыя БРСМ, што ладзіцца па ўсёй краіне. Цяпер і ў нас яна стала традыцыйнай.

Паступова «Сёмае неба» пачало ўсё часцей заяўляць пра сябе на гарадскім узроўні — дапамагаць адукацыйным і медыцынскім установам, асобным сем'ям і арганізацыям.

— Першым часам задачы падкідваў БРСМ: да іх часта звяртаюцца з просьбамі, а яны, у сваю чаргу, перадаюць іх у пярвічныя арганізацыі. Дзякуючы Саюзу моладзі завязалася сталае супрацоўніцтва з многімі арганізацыямі.



«Не саромейцеся праяўляць эмоцый», — раіць камандзір атрада Іван Дусянок.

На думку кіраўніка атрада, валанцёрства — гэта нават не магчымасці, а жаданне зрабіць добрую справу для іншага.

— Многім здаецца, што займацца падобнымі рэчамі могуць толькі маладыя людзі, у якіх хапае вольнага часу. Ва ўсіх удзельнікаў нашага атрада сем'і, хатнія справы, але гэта не перашкаджае зазірнуць на гадзінку ў інтэрнат да сірот і проста паразмаўляць з імі. Дробязь, якая можа задаць добры настрой на некалькі дзён, — расказвае хлопец. — Займацца добрымі справамі можна не толькі ў атрадзе. Просты прыклад — дапамога матулям, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. У некаторых шматпавярховых дамах няма пандусаў і ліфтаў, таму выхад на вуліцу для калясачнікаў становіцца сапраўдным выпрабаваннем. Спуск па лесвіцы часам займае больш часу, чым уласна прагулка. А з дапамогай валанцёраў можна справіцца з праблемай за некалькі хвілін. Азірніцеся навокал. Магчыма, у суседнім доме якраз жыве сям'я, якой неабходна ваша падтрымка.

Сёння валанцёрскія атрады ёсць у многіх школах, каледжах, ВНУ. Аднак, па словах кіраўніка «Сёмага неба», маладзенькія хлопцы і дзяўчаты могуць справіцца далёка не з усім:

**«Назву атраду далі рамантычную — «Сёмае неба». Чаму? А гэта ўжо няхай кожны для сябе сам вырашае...»**

— Неяк нас папрасілі дапамагчы пры выгрузцы новага абсталявання для бальніцы. Мы, заводскія хлопцы, сілу маем. Дапамаглі. Супрацоўнічаем і з жаночай калоніяй, якая ёсць у горадзе. Ездзілі з канцэртам, набывалі падарункі для дзетак, што выхоўваюцца ў Доме дзіцяці пры папраўчай установе. Словам, на чымсьці адным не зацыкліваемся і заўсёды адкрытыя да новых заклікаў і прапаноў.

Іван — чалавек сціплы, дзейнасць атрада не ўспрымае як нешта выключнае і не любіць пералічваць поспехі, якіх дасягнуў. Аднак адным праектам ганарыцца асабліва.

— У 2017-м разам з Веранікай Ражковай мы запусцілі «Школу дабра». Па сутнасці, гэта падрыхтоўчыя курсы для будучых валанцёраў. Нельга адарваць чалавека ад станка і адразу ж завесці яго ў дзіцячы дом ці да людзей з інваліднасцю. Трэба рыхтавацца маральна. У «Школе дабра» праводзіліся семінары, трэнінгі, тэматычныя гульні — усё, каб навучыцца ўстанаўліваць кантакт без боязі і непатрэбнага жалю. Часта менавіта яны перашкаджаюць валанцёрам-пачаткоўцам.

— Матэрыяльная дапамога — гэта добра і патрэбна, але яшчэ не ўсё. Мы даўно супрацоўнічаем з Гомельскім домам-інтэрнатам для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Валанцёры, як правіла, самі прыходзяць да іх. Мы ж вырашылі дзейнічаць наадварот: запрасілі дзяцей у кінатэатр і кавярню. Такія мерапрыемствы карысныя тым, што не дзеляць грамадства на «асаблівых» і звычайных. Мы ўсе роўныя, і не трэба стварэць перашкоды там, дзе іх быць не павінна.

Іван прызнаецца, што не любіць пытання: «Што для вас значыць быць валанцёрам?»

— Гэта складана патлумачыць словамі. З аднаго боку, ты аддаеш час і сілы. З другога, атрымліваеш пазітыўныя эмоцыі і зарад энергіі. Нават калі проста займаешся добраўпарадкаваннем тэрыторыі ці цягаеш мэблю. Бо ведаеш — гэта на карысць іншым. Сёння валанцёрскі рух у Беларусі даволі папулярны, тут кожны можа выбраць кірунак для сябе — экалогія, дзеці, людзі сталага веку. Галоўнае — пачаць!

**Ганна КУРАК.**

*Мінск — Гомель — Мінск.*

# У БІБЛІЯТЭКАРЫ — З... ФУТБОЛЬНАЙ КАМАНДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Уступленне ў сапраўднае дарослае жыццё было хвалюючым для цябе?***

— Спачатку мне было вельмі страшна. Іншы горад, так далёка ад дома. Баялася, што не спраўлюся з работай, не пасябрую з калегамі. Аднак калектыў трапіўся цудоўны. Працуем дружна, падмяняем адно аднаго, калі трэба. Да самастойнага жыцця прызвычаілася досыць хутка, бо яшчэ падчас вучобы ў Магілёве жыла ў інтэрнаце.

***— А якім было першае ўражанне пра горад-спадарожнік сталіцы?***

— Смалявічы мне адразу спадабаліся. Асабліва прырода тут прыгожая. Але што датычыцца месцаў для «выхаду ў людзі»... Выбрацца асабліва няма куды. Добра, што Мінск побач. Гэта кампенсуе недахоп забаўляльных месцаў для моладзі, крам адзення, касметыкі. Для мяне як для маладой дзяўчыны гэта вельмі важна. Але я ведаю, што ў нас будуецца гандлёвы цэнтр, у якім будзе ўсё неабходнае. Вельмі чакаю яго з'яўлення.

**«Калі чалавек прыходзіць часта, нават магу адгадаць, што ён возьме сёння».**

***— Што наконт жылля? Маладым спецыялістам даецца інтэрнат?***

— Так, жыву з дзяўчынай у пакоі ўдзвюх. Кошт, дарэчы, не вельмі вялікі — каля сарака рублёў. Інтэрнат задавальняе. У мяне патрабаванні сціплыя, дах ёсць — і выдатна. Я лічу, што ўсё залежыць ад цябе самога. Ты ахайны чалавек — і ў пакоі будзе чыста і прыгожа. А калі не, дык ніякія еўрарамонты не дапамогуць.

***— Раскажы пра сваю работу. Што ўваходзіць у твае службовыя абавязкі?***

— Працую я ў чытальнай зале. У асноўным праводжу дзень у аддзеле ПЦПІ (публічны цэнтр прававой інфармацыі). Сюды часта прыходзяць студэнты ў пошуках адпаведнай літаратуры, у асноўным тыя, хто вучыцца на юрыста. Таксама бываюць пенсіянеры, служачыя. Звяртаюцца па запыты ў «Эталон» — прававы партал.

Чытальная зала ў нас карыстаецца папулярнасцю, ёсць пастаянныя наведвальнікі. Я ніколі не думала, што змагу запомніць іх імёны, а тым больш асабістыя чытацкія нумары! Але калі чалавек прыходзіць часта, нават магу адгадаць, што ён возьме сёння.

Яшчэ я праводжу мерапрыемствы ў гімназіі, расказваю пра законы, правы дзіцяці. З навучэнцамі нашага аграрна-тэхнічнага ліцэя абмяркоўваем правапарушэнні. Звычайна ладжу віктарыны. Напрыклад: «Што бывае за распіццё спіртных напояў у грамадскім месцы?» Або абмяркоўваем законы іншых краін.

***— Ці бываюць у наведвальнікаў нейкія асаблівыя запыты?***

— Аднойчы да нас прыходзіла жанчына, якой была патрэбна раённая газета «Край Смалявіцкі» за мінулае стагоддзе! Гэта было не так проста. Я ўпэўнена, што яна пісала нейкае краязнаўчае даследаванне.

З просьбай знайсці стары нумар якой-небудзь газеты звяртаюцца часта. Заўсёды цікава, навошта людзям выпускі такой даўніны. Я неяк спытала. Адказалі, што ў тым нумары быў надрукаваны артыкул аб прабабулі чытача.

***— Ці збіраешся заставацца ў горадзе і ў бібліятэцы, калі пройдуць два гады адпрацоўкі?***

— Загадваць не буду, розныя здараюцца абставіны. Сёлета я планую паступаць у Акадэмію МУС на юрыста. Калі ўсё складзецца, буду працаваць у гэтай галіне. А цяперашнім працоўным месцам я задаволена.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка I курса факультэта журналістыкі БДУ.**

**Фота аўтара.**

Трэці працоўны

# «ЭЎРЫКА»: прэстыжна, карысна, цікава

**Па выніках работы ў працоўным семестры за мінулы год найлепшым будаўнічым атрадам краіны стала «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Яронькі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. І гэта чацвёрты раз! А шчыравалі хлопцы на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы. Якім чынам праходзіць адбор байцоў у атрад і якія прафесіі найбольш запатрабаваныя? Пра гэта мы даведаліся ў капітана «Эўрыкі» Івана САЎЧАНКІ.**



— Наш атрад паедзе сёлета ў Астравец шосты раз. Падчас набору ахвотных увага аддаецца многім паказчыкам: узросту, паспяховасці навучання, здароўю, наяўнасці будаўнічай спецыяльнасці і нават жыццёвай пазіцыі. Самымі запатрабаванымі з'яўляюцца бетоншчыкі, маляры, геадэзісты, арматуршчыкі, муляры. Работа бывае цяжкая, таму на будоўлю не бяруць дзяўчат, хоць у расійскіх атрадах яны сустракаюцца.

Іван расказвае, што працоўны дзень можа доўжыцца або восем гадзін, або дванаццаць. У атрадзе фіксаваная колькасць чалавек — не больш за дваццаць. Трапляюць на будоўлю не ўсе ахвотныя: летась конкурс складаў пяць чалавек на месца.

— Радуе, што звычайна байцы прыходзяць у атрад падрыхтаванымі да работы. Увогуле ў нашым універсітэце знаходзіцца ў складзе студатрада лічыцца прэстыжным, таму многія хочуць сюды патрапіць. Да таго ж гэта дадатковыя грошы, а для некаторых студэнтаў — першыя самастойна заробленыя ў жыцці, — кажа Іван.

Акрамя работы, у байцоў ёсць і вольны час, які заўсёды праходзіць актыўна. Правядзенне мерапрыемстваў, спартыўныя гульні, напісанне песень, вершаў і многае іншае — тыповыя заняткі хлопцаў увечары. У «Эўрыкі» ёсць свой сцяг, сімвал і асаблівая традыцыя — прысвячэнне ў байцы будаўнічага атрада.

— Работа для нас пачынаецца ў пачатку ліпеня, доўжыцца да канца жніўня. Звычайна мы прачынаемся а палове шостай раніцы, а сёмай гадзіне ўжо на месцы. Дарэчы, працуем не толькі на АЭС, а і ў самім горадзе: узводзім бальніцу, жылыя дамы, — працягвае суразмоўнік.

Іван дадае, што не ўсе аказваюцца гатовыя да спёкі і вялікіх аб'ёмаў работы. У такія моманты і патрэбен камандзір побач, каб падтрымаць словам і дапамагчы дзеяннем. Але ёсць і прыемны бонус — гэта час, праведзены разам.

— Ніхто не ходзіць з сумным тварам, не зайздросціць калегам і не канкурыруе, — кажа ён. — Усе роўныя, бо сабраліся дзеля адной справы. Пасля працоўнага семестра часта сустракаемся ў вольны час і на розных мерапрыемствах.

— На рабоце ў Астраўцы летась я быў упершыню, — кажа **выпускнік інжынерна-будаўнічага факультэта ПДУ Дзмітрый ШЧАРБЯНОК.** — Для мяне гэта карысны досвед, бо ён па маёй спецыяльнасці. Каб у далейшым стаць добрым кіраўніком, трэба прайсці ўсе ступені развіцця па кар'ернай лесвіцы.

**Студэнт трэцяга курса таго ж факультэта Павел МАШКАЛА** пра магчымасць уступіць у атрад даведаўся ад суседзяў па інтэрнаце. Яны запэўнілі хлопца, што гэты вопыт будзе вельмі карысны. Зрэшты, матывацыя стымулявала Паўла на працоўныя подзвігі і ў папярэднім годзе.

— Спачатку было цяжка прызвычаіцца да ранніх пад'ёмаў, але праз тыдзень мы прачыналіся ўжо раней за гадзіннік. Уражанне ад летняга заезду засталося прыемнае, хачу і надалей працаваць у будатрадзе, — упэўнены хлопец.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Усё — у тваіх руках!

# «Самы лепшы час у Беларусі»

## Сакрэты добрага адпачынку ад Дзмітрыя КАХНО

**Сонца, пляж, вандроўкі, лецішча... Лета кожны хоча правесці незабыўна. Якім яно было ў дзяцінстве ў папулярнага тэлевядучага, як ён любіць бавіць яго цяпер? Дзе і як адпачывае? Пра гэта суразмоўнік расказаў нам у невялікім інтэрв'ю.**



***— Вы нядаўна былі на Кіпры. Мяркуючы па фотаздымках у Instagram, даўно займаецеся віндсёрфінгам...***

— Каля сямі гадоў. Шчыльна, напэўна, тры. Галоўныя ў маім жыцці віды спорту (пляжны валейбол, більярд і віндсёрфінг) паказалі бацькі яшчэ ў дзяцінстве. Валейболам я захапіўся, калі мама ўзяла мяне, паўтарагадовага, на трэніроўку, падавала мяч і разбіла мне нос. *(Смяецца.)* У більярд пачаў гуляць у дзевяць гадоў, калі ў бізнес-цэнтры побач з домам адкрылася адпаведная школа і мяне туды паклікалі бясплатна. З віндсёрфінгам — падобная гісторыя. Мой айчым быў адзін з нешматлікіх людзей у Беларусі, хто займаўся гэтым відам спорту яшчэ ў савецкія часы. Дошка называлася «Мустанг», велізарная, чырвоная, цяжэнная. Я памятаю, як мы адпачывалі на Нарачы: пачынаецца навальніца, людзі бягуць з возера. А айчым, штурхаючы двухколавую тачку, бяжыць з рыштункам да вады, каб паплаваць, уварочваючыся ад маланак і хваляў. І я таксама захацеў займацца віндсёрфінгам. Апошнім часам люблю гэтую невератодную самоту на вадзе. Вельмі дапамагае пры маёй публічнай прафесіі. Дарэчы, віндсёрфінг вельмі цяжкі ў асваенні. Гадамі на дошцы трэба пакутаваць, каб развучыць нейкія элементарныя рэчы.

***— Пра што вы думаеце, калі плывяце ў моры?***

— Часам спяваю песні. Часцей за ўсё — Фрэнка Сінатру: «My way», «Fly me to the moon». А пра што думаю? У гэтым і плюс віндсёрфінга, што ты не паспяваеш думаць. Стаіш на дошцы, якая пад табой пастаянна круціцца, трымаеш у руках ветразь, што спрабуе вырвацца... І таму ўсё, чым ты заняты, — гэта пошукі гармоніі паміж вадой і ветрам. Віндсёрфінг — выдатная магчымасць для арганізма расслабіцца: усе свае рэсурсы мозг мабілізуе на занятак спортам.

Дарэчы, і ў Беларусі можна займацца віндсёрфінгам. Вецер дзьме на возеры Нарач, у Навалукомлі і на Мінскім моры — там у нас свая адносна невялікая супольнасць віндсёрфераў «Экстрым» і станцыя, дзе трэніруецца беларуская алімпійская зборная (там мы захоўваем свой рыштунак).

***— Для вандровак выбіраеце толькі цёплыя краіны?***

— У іх звычайна праходзіць мой зімовы адпачынак. Улетку падарожнічаю вельмі рэдка, таму што пераканаены — гэта найлепшы час у Беларусі. Гэта ж проста кайф!

***— А ў дзяцінстве летам што любілі рабіць?***

— Канікулы былі класічныя — альбо дача, альбо піянерскі лагер. Уласна, дзякуючы апошняму адбылася мая трансфармацыя з інтраверта ў відавочнага экстраверта.

***— І як, цікава, лагер паспрыяў гэтаму?***

— Першы раз я не пазнаёміўся ні з адной дзяўчынай за ўсю змену. Думаў, чаму? Вырашыў, што дзяўчаты не звяртаюць увагу на ціхіх, сціплых і добрых хлопцаў. Трэба быць больш яркім, весёлым і смялейшым. Прайшоў год. Перад тым як ехаць зноў у лагер, я пайшоў у сэканд-хэнд, купіў велізарную майку амаль да калена і клятчастыя штаны-трубы. Тады гэта было вельмі модна. Карацей, на новую змену ў лагер я прыехаў вельмі круты. І ў першы ж вечар пазнаёміўся з дзяўчынай. Лагер — гэта выдатная школа сацыялізацыі. Першая дыскатэка там выглядае як? Дзеці разбітыя на дзве групы — дзяўчынак і хлопчыкаў. І ніхто ні з кім не танцуе павольны танец, хоць усе хочуць. Я, навучаны горкім вопытам мінулай змены, у першы ж вечар падышоў да самай прыгожай дзяўчынкі і запрасіў яе. А ўжо ў канцы дыскатэкі прапанаваў ёй сустракацца. І гэта спрацавала!

***— У вас сын Платон, яму год і тры месяцы. Як ён бавіць летні час?***

— Спіць уначы і два разы ўдзень. Выдатна сілкуецца і вучыцца ў гэтым свеце жыць. У спёку праводзіць час на лецішчы разам з Надзяй (жонкай. — **Аўт.**). Час ад часу яны прыязджаюць да мяне на пляжны валейбол на Мінскае мора, дзе я амаль кожны дзень. Там Платон жыве сапраўдным жыццём цудоўнага маленькага чалавека.



***— Дык як добра правесці самую лепшую пару года, па версіі Дзмітрыя Кахно?***

— Адправіцца на Мінскае мора і гуляць у пляжны валейбол або паспрабаваць нешта новае і экстрэмальнае, напрыклад той жа віндсёрфінг. Пракаціцца на скейце да работы і назад. І прыслухацца да парады нашага Прэзідэнта — завесці дзіця ў наступным годзе. *(Смяецца.)* Таму што дзеці — гэта шчасце.

**Ганна ВАРОНКА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ УП «Могилевское отделение БелТПП» 22 августа 2019 в 14.00

**проводит торги по продаже следующего объекта**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 700/С-14875 (назначение — здание специализированное иного назначения; наименование — склад), общей площадью — 947,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Гомельское, 53 в.

**Начальная цена продажи с учетом НДС: 162 000,00** (Сто шестьдесят две тысячи белорусских рублей 00 копеек), задаток — 16 200,00 (Шестнадцать тысяч двести белорусских рублей 00 копеек).

**Собственник имущества:** Открытое акционерное общество «Автомотосервис и торговля-1», г. Могилев, Гомельское шоссе, 53в.

